Віктар ЯРАЦ

# ТРЫЦЦІХ ТРЫВОЖНАЙ ЦІШЫНІ

I

Начных вакзалаў гукі і агні
мяне хрысцілі з самага маленства
трывогамі і ценямі вайны,
хоць нехрысцям я быў у паслушэнстве.
Пад спеў гудкоў я рос у цягніках.
Мне калыханку разам з маці пелі
вятры ў разбітых рускіх гарадах
і сосны, што ад гневу пасівелі.
Мне і сягоння нават у цішы
здаецца, што грукочуць побач колы
тых цягнікоў, якім заўжды спяшыць
праз белы студзень, май зялёна бровы.
Я зведаў з дзён скупых на хлеб салодкі
багацце чалавечай дабраты,
калі салдаты ў выцвілых пілотках
мне цукрам падсалоджвалі гады.
Таму з тых дзён я ведаю і помню,
што ёсць бязмежжа неба і зямлі,
але шырэй за ўсё на свеце — промні
вачэй і сэрцаў, поўных цеплыні!

II

Яшчэ не раз прысніцца ноччу:
паўстанкі, чэргі за вадой,
і паравоз чорнарабочы,
прапахлы дымнаю вайной.
Той паравоз вязе дадому
па ўсёй краіне мірны дзень,
і толькі горкі, чорны цень
плыве над сіплаю трубою.
Між гарадоў плыве той цень
і вёсак, поўных пахаронак,
каб не забылася нідзе
Зямля траншэй, Зямля варонак...
Раскалыхалі птушкі раніцу.
Азваўся голуб за акном.
Але ад памяці не збавіцца
ні ноччу доўгаю, ні днём.
Напомніў успамін наструнены,
што, як салдат, мая зямля
падперазалася чыгункаю
накшталт армейскага рамня.

III

Няхай калышуць птушкі раніцу,
вуркоча голуб за акном.
Трывога ж вечнаю абранніцай
ляціць з падломаным крылом.
Яна ляціць над нашай памяццю,
над тым, што будзе і было,
дзе ў свет, што з сонцам прачынаецца,
мае расчынена акно,
нібы душа, нібыта вочы
усіх жывых і не жывых,
дзе промні вылецілі з ночы,
як птушаняты з гнёзд сваіх...



**Цудоўны святочны настрой у гэтых дзяўчат з вакальна-інструментальнага ансамбля «Сонейка» біёлага-глебавага факультэта. Іх выступленне адзначана на абласным аглядзе-конкурсе, які прысвячаўся 30-годдзю Вялікай Перамогі, шмат апладысментаў заслужылі яны на ўніверсітэцкім конкурсным канцэрце, а таксама на канцэрце ў гонар Першамайскага свята.**

Фота А. Рудчанкі.

*Яны вучыліся ў нашай ВНУ*

## «НА БОЙ Я ІДУ»

Беларускі паэт Кастусь Кірэенка закончыў літаратурны факультэт Гомельскага педінстытута ў 1940 годзе. Хаця ён з Магілёўшчыны, палюбіў наш горад. Там, у Слаўгарадскім раёне, дзе нарадзіўся Канстанцін Ціхавіч, як і ў Гомелі, ціха нясе свае воды Сож. Вобраз роднай рэчкі паўстае з многіх вершаў паэта.

У гады вайны К. Кірэенка быў ваенным карэспандэнтам, удзельнічаў у абароне Масквы, у вызваленні Беларусі і Польшчы. Яго глыбокапатрыятычныя вершы, датуемыя гадамі 1941—45, перадаюць гераізм і мастацкую праўду незабыўных дзён.

Смуткам пранізаны радкі паэта, якія ён прысвячае свайму таварышу Л. Гаўрылаву, загінуўшаму ў першы год вайны.

**Скора дзень. Бачыш, як дрыжыць**
**Над Сожам цёплы свет барвовы?**
**Прывітальныя сонцу словы,**
**Смутак мой, добры мой, кажы.**

У творах былога франтавіка гучыць адказнасць патрыёта-байца за лёс чалавецтва, за мір на зямлі. У 1941 годзе паэт пісаў

**Хай мне даруюць травінкі і дрэвы,**
**Каля азёр маіх пушчы-лясы,**
**Што ад грымот не ўбярог іх напеваў,**
**Што ад агню не ўбярог іх красы.**
**Мілая вёска разлогаў кілімы,**
**Сцежкі, і рэчка, і дуб на браду!**
**Верце: без вас мне жыццё немагчыма,**
**Вось чаму сёння на бой я іду.**

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Купалы, К. Кірэенка на сваім рахунку мае шмат зборнікаў паэзіі і прозы. Цяпер ён — галоўны рэдактар часопіса «Полымя».

Прапануем увазе чытачоў адзін з вершаў паэта.

Алесь ЛОЗКА.

□

### АПОШНЯЕ ВІТАННЕ

Я напісаў табе пісьмо
Яшчэ вясной зялёнай,
А толькі сёння аддаю
У рукі паштальёну.
Я аддаю і не прашу,
Каб ён спяшаўся з поштай.
Цябе ўсё роўна не вярнуць,
А снамі жыць навошта?
Далёка, недзе за Дняпром,
На магілёўскіх лядах
Ляжыць маленькі груд зямлі
Пад гільзай ад снарада.
Убрала восень навакол
Палі і луг стракатa.
І не знайсці маім лістам
Прытулку адраса[illegible].
Паходзяць, сумныя, яны
Па ўсёй зямлі і з жалем
Калісьці вернуцца назад,
Туды, дзе казкай сталі.
Я пакладу іх у кішэнь,
Душа замрэ на хвілю.
Але прыпомняцца шляхі,
Дзе мы ў баі хадзілі,
І я ізноў паверу снам,
Што ты ажыў, — паверу
І ў белы свет
Цябе вітаць
Пашлю лісток паперы.
Так, я пісаў сваё пісьмо
Яшчэ вясной зялёнай.
А толькі сёння аддаю
У рукі паштальёну.

Кастусь КІРЭЕНКА

1945 г.

## КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў МАГІЛЁВЕ

У канцы красавіка ў Магілёўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце праходзіла студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 30-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. На 15 секцыях прадстаўнікі з многіх ВНУ краіны і навуковая моладзь інстытута прачыталі свае работы, адзначаныя катэгорыямі на рэспубліканскім конкурсе. Тэматыка многіх дакладаў раскрывала гераізм і працоўны ўклад народа ў перамогу над фашысцкай Германіяй.

У рабоце канферэнцыі актыўны ўдзел прынялі і прадстаўнікі нашага ўніверсітэта. Студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта І. Верашчагіна і С. Кудраўцава прачыталі свае работы на секцыі гісторыі СССР, а выпускнік А. Дуброўскі выступіў па паэзіі Рыгора Барадуліна і А. Лозка — па творчасці Сяргея Грахоўскага на секцыі беларускай літаратуры.

Гасцям былі ўручаны граматы, падарункі, сувеніры і была арганізавана экскурсія па інстытуту.

А. АЛЕСЕЎ.

## НА ВЕТЭРАНАЎ ТРЫМАЛІ РАЎНЕННЕ



Стадыён ГДУ заліты яркім веснавым сонцам. Пасля заняткаў сюды прыйшлі многія сотні студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта, каб прыняць удзел у спартыўным свяце, прысвечаным 30-годдзю Вялікай Перамогі.

...Гучаць фанфары. Пачынаецца агляд факультэцкіх калон. Іх узначальвае ветэран Вялікай Айчыннай вайны, падпалкоўнік запасу, лабарант кафедры фізвыхавання А. А. Косцікаў. Першымі на дарожку стадыёна выходзяць сцяганосцы. Рослыя, фізічна загартаваныя юнакі нясуць сцягі саюзных рэспублік, спартыўныя флагі ўсіх відаў спорту, якія культывуюцца ва ўніверсітэце. Праходзіць калона чэмпіёнаў.

І вось позіркі ўдзельнікаў святочнай урачыстасці прыцягвае калона ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны на чале са старшым выкладчыкам кафедры спартыўных гульняў і гімнастыкі А. В. Архіпавым. На грудзях кожнага з іх ззяюць пазалотай баявыя ўзнагароды — адзнака мужнасці і гераізму, праяўленага ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У цэнтры стадыёна калоны заміраюць. Слова прадастаўляецца прарэктару ўніверсітэта па вучэбнай рабоце дацэнту Д. А. Лявончанку. Дзмітрый Андрэевіч прайшоў дарогамі вайны ад першых і да апошніх яе дзён. Таму кожнае слова, выказваемае ім у адрас ветэранаў, гучыць з пачуццём вялікай удзячнасці.

Ад ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны выступіў маёр запасу, кавалер трох ордэнаў Чырвонай Зоркі і многіх іншых баявых узнагарод прэпаратар кафедры фізвыхавання А. І. Рыбін. Гэты чалавек — вельмі цікавага, гераічнага лёсу. У даваенны час ён стаў адным з першых значкістаў ГПА, з Краснай плошчы адпраўляўся на фронт, на гэтай жа Краснай плошчы ў Маскве ў незабыўным 1945 годзе прымаў удзел у парадзе Перамогі. Цяпер Аляксандр Іванавіч з'яўляецца чэмпіёнам рэспублікі і вобласці сярод мнагаборцаў ГПА пятай групы.

Як клятва быць дастойнымі ветэранаў, ад імя сённяшняй моладзі прагучалі словы абсалютнага чэмпіёна студэнцкага таварыства рэспублікі па гімнастыцы, студэнта эканамічнага факультэта Б. Міхайлава.

Ва ўрачыстай абстаноўцы старшыня гарадскога камітэта па фізкультуры і спорту В. Ц. Сцепанцоў уручыў спортклубу ўніверсітэта кубак Рэспубліканскага спорткамітэта за другое месца, занятае на І-х маладзёжных гульнях Беларусі па праграме VI Рэспубліканскай спартакіяды і кубак за першае месца за лепшыя дасягненні ў гарадскім аглядзе-конкурсе па пастаноўцы спартыўна-масавай і аздараўленчай работы за 1974 год. Ён уручыў таксама граматы гарадскога спорткамітэта многім ветэранам вайны і спорту. Граматы Белсавета СДСТ «Буравеснік» і СК ГДУ уручыў узнагароджаным старшыня ўніверсітэцкага спортклуба В. І. Селіванаў.

...Спартыўнае свята пераходзіць на новы этап. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны А. І. Рыбін і ветэран беларускага спорту, загадчык кафедры лёгкай атлетыкі, заслужаны трэнер Беларускай ССР, майстар спорту М. П. Талстапятаў у суправаджэнні асістэнтаў чэмпіёнаў студэнцкага таварыства рэспублікі па лёгкай атлетыцы С. Башынскага і па гімнастыцы А. Ананьева выносяць флаг СДСТ «Буравеснік» і ўзнімаюць яго разам з Дзяржаўным флагам СССР на флагшток.

Пачынаюцца лёгкаатлетычныя спаборніцтвы. Група мацнейшых спартсменаў універсітэта зрабіла сімвалічны прабег па маршруту Курган Славы — Вечны агонь — універсітэт. Чэмпіён Белсавета «Буравеснік» па лёгкай атлетыцы У. Якутовіч ад Вечнага агню прынёс факел, якім на стадыёне ў чашы запаліў сімвалічны агонь Перамогі.

З вялікай цікавасцю ўдзельнікі свята сачылі за ваенізаванай эстафетай. Мацнейшай стала каманда эканамічнага факультэта.

Многа спартсменаў выйшла на старты мнагабор'я ГПА на прызы «Комсомольской правды».

...Спартыўнае свята ў гэты дзень працягвалася да самага вечара. Яно вылілася ў яркую дэманстрацыю вернасці нашай моладзі слаўным традыцыям, раўнення на ветэранаў, высокай гатоўнасці ў любы час стаць на абарону любімай Радзімы.

Вечарам калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта фізічнага выхавання выступіў з конкурсным канцэртам, прысвечаным юбілею Перамогі.

Б. ВАЛОДЗІН.

**На здымку: агляд калон.**

Фота А. Рудчанкі.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 02197 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 2864.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, галоўны корпус ГДУ, п. 4-19, т. 6-16-23.